УДК 373.5.016:[811.161.3+821.161.3.09]

# ТЫПАЛАГІЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ АЛІМПІЯДНЫХ ЗАДАННЯЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

Доўгаль Дзмітрый Аляксандравіч
дацэнт кафедры пачатковай адукацыі і лінгвадыдактыкі
ўстановы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова"
(г. Магілёў, Беларусь)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Артыкул прысвечаны разгляду тыпалагічных характарыстык заданняў да алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура". Устаноўлены асаблівасці зместу і формы заданняў комплекснай работы раённага этапу рэспубліканскай алімпіяды.*

Нягледзячы на тое, што алімпіяда па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура" на працягу доўгага часу з'яўляецца эфектыўнай формай пазакласнай работы з адоранымі і высокаматываванымі вучнямі, пытанні тэорыі і практыкі складання алімпіядных заданняў не атрымалі належнай увагі ў спецыяльнай літаратуры і нарматыўных актах, у прыватнасці ў "Інструкцыі аб парадку правядзення рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах". У дадзеным артыкуле падаецца адна з першых спроб характарыстыкі заданняў, іх відаў, змястоўнага напаўнення аднаго з конкурсаў алімпіяды – комплекснай работы па мове і літаратуры. Складанасць тэмы абумоўлена ў тым ліку і вялікай разнастайнасцю прыкмет і ўласцівасцей, як лінгвістычна-літаратуразнаўчых, так і метадычных, якія служаць асновай для тыпалагізацыі алімпіядных заданняў. Паспрабуем на матэрыяле заданняў, якія выкарыстоўваліся пры правядзенні другога (раённага) этапу рэспубліканскай алімпіяды ў Магілёўскай вобласці ў 2015–2017 гг., адлюстраваць абодва аспекты.

Комплексная работа ахоплівае розныя раздзелы мовазнаўства, якія вывучаюцца на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, і складаецца з 8–10 заданняў. Парадак размяшчэння лінгвістычнага матэрыялу ў цэлым адпавядае лінейнай паслядоўнасці яго вывучэння ў школе: фанетыка → лексікалогія / фразеалогія → марфеміка / словаўтварэнне → марфалогія → сінтаксіс. Заданні па мовазнаўстве дапоўнены заданнямі па тэорыі і гісторыі літаратуры. Аднак заданні, прысвечаныя праверцы ведаў і ўменняў навучэнцаў па адным канкрэтным раздзеле, нешматлікія. Часавыя рамкі конкурсу (дзве гадзіны

на выкананне ўсёй работы) абумовілі камбінаваны характар значнай часткі заданняў. Так, заданне *З прапанаваных слоў выпішыце тыя, у якіх корань складаецца з камбінацыі гукаў <u>зычны+галосны+зычны</u>*, вымагае ад удзельніка прымянення як марфемных (вызначэнне кораня ў слове), так і фанетычных (запіс вызначанага кораня ў транскрыпцыі) навыкаў. Заданне *Знайдзіце ў загадках прыметнікі, вызначыце іх сінтаксічную ролю і лексіка-граматычны разрад* у адносна кавай ступені з'яўляецца марфалагічным і сінтаксічным. Часам такое спалучэнне дазваляе характарызаваць заданні як інтэграваныя (мовазнаўства + літаратуразнаўства): *Вызначыце від выказніка ў вершаваных радках Максіма Багдановіча. Назавіце вершы, з якіх узяты гэтыя цытаты* або *У літаратурна-крытычным артыкуле "За тры гады" (1913) Максім Багдановіч даў характарыстыку беларускаму прыгожаму пісьменству. Запішыце фрагменты гэтага артыкула ў адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі сучаснай беларускай мовы. Здагадайцеся, якіх пісьменнікаў характарызаваў М. Багдановіч.*

Змешчаная ніжэй табліца дазваляе не толькі акрэсліць зместавае напаўненне комплексных алімпіядных работ у 11 класе, але і адлюстроўвае тэндэнцыю павелічэння ў іх колькасці камбінаваных, у тым ліку інтэграваных, заданняў (нумары такіх заданняў вылучаны паўтлустым шрыфтам).

**Зместавае напаўненне комплексных работ II этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура" ў 11 класе (2015–2017 гг.)**

| | Раздзел | 2015 | 2016 | 2017 |
|---|---|---|---|---|
| | | Нумары заданняў | | |
| мовазнаўства | фанетыка | | **1** | **1**, **3**, **7** |
| мовазнаўства | арфаграфія | 1 | **5** | **2**, **5** |
| мовазнаўства | лексікалогія | 2 | **2**, **4** | **2**, **5**, **6** |
| мовазнаўства | фразеалогія (парэміялогія) | **4** | 3 | 4, **6** |
| мовазнаўства | марфеміка | 3 | **1**, **2** | **3** |
| мовазнаўства | словаўтварэнне | 6 | 7 | 7 |
| мовазнаўства | марфалогія | **4**, 5 | **4**, **7** | **5**, **7** |
| мовазнаўства | сінтаксіс (пунктуацыя) | **6** | **5**, **7** | **7** |
| літаратуразнаўства | | 7, 8 | **5**, 6, **7**, 8 | **1**, 8, 9 |

Літаратуразнаўчы кампанент, як вынікае з табліцы, прадстаўлены ў 25–50 працэнтах ад усёй колькасці заданняў комплекснай работы. Яны прысвечаны праграмным літаратурным творам, біяграфіям пісьменнікаў-юбіляраў (рэкамендаваны спіс падаецца штогод у інструктыўна-метадычным пісьме Міністэрства адукацыі РБ), пытанням гісторыі і тэорыі літаратуры.

З пункту гледжання формы прад'яўлення алімпіядных заданняў найчасцей выкарыстоўваюцца тэсты, лінгвістычныя задачы, заданні на пераклад.

У алімпіядных комплексных работах тэставыя заданні бываюць як закрытага, так і адкрытага тыпу. Сярод першых вылучаюцца заданні на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі розных спісаў (*Устанавіце адпаведнасць паміж матэрыяламі слоўнікавых артыкулаў і слоўнікамі, адкуль яны ўзяты. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў*), заданні з множным выбарам адказаў (*Сярод прапанаваных сказаў з твораў Алеся Разанава адзначце тыя, што адпавядаюць пададзеным характарыстыкам (правільных адказаў можа быць больш за 1)*), заданні на класіфікацыю матэрыялу (*Размяркуйце назвы людскіх прафесій і заняткаў у залежнасці ад месца націску*). Сярод тэставых заданняў адкрытага тыпу вылучаюць заданні на дапаўненне (*Назавіце прозвішча вучонага і пісьменніка, прапушчанае ў тэксце: «Моцны ўплыў на творчасць Святланы Алексіевіч аказаў ____________ і кнігі "Я з вогненнай вёскі" і "Блакадная кніга", што з'явіліся з яго ўдзелам»*) і заданні на свабодны выклад матэрыялу (*Укажыце фразеалагізм, які не трапіў у табліцу, і сфармулюйце яго значэнне*). Колькасць падобных заданняў абмежаваная, паколькі яны, у адрозненне ад тэставых пытанняў закрытага тыпу, выклікаюць складанасць пры праверцы і ацэнцы.

Задача – гэта дыдактычны твор, які прадугледжвае вырашэнне лінгвістычнай / літаратурнай праблемы, акрэсленай ва ўмове. Прыклады алімпіядных задач такога кшталту змешчаны ў нашым дапаможніку па падрыхтоўцы да алімпіяды [1]: *Беларускі пісьменнік і моваавед Уладзімір Дубоўка ў артыкуле "Некаторыя прыватныя выпадкі мілагучнасці нашае мовы" (1927) прапанаваў удакладніць ужыванне прыстаўнога **в** у пачатку слоў. У прыватнасці, У Дубоўка сфармуляваў правіла ўжывання прыстаўнога **в** перад ненаціскным **а**. Сваё правіла пісьменнік праілюстраваў прыкладамі: вялікія вазёры, на вялікіх азёрах; ночкаю васенняю, спраўляў асяніны. Паспрабуйце і вы сфармуляваць прыдуманае У Дубоўкам правіла* [1, с. 6]. Прыклад задачы з літаратурным зместам: *Рэмінісцэнцыяй у літаратуразнаўстве называецца наўмыснае ці міжвольнае ўзнаўленне пісьменнікам (найчасцей паэтам) вобразаў, асобных выказванняў ці рытміка-сінтаксічных канструкцый іншых аўтараў. Знайдзіце рэмінісцэнцыі з беларускай літаратуры ў наступных паэтычных фрагментах сучасных літаратараў. Укажыце творы, якія паслужылі асновай для рэмінісцэнцый, і іх аўтараў* [1, с. 47–48].

Праца над перакладам спрыяе ўдасканаленню граматычных ведаў, пісьменнасці, развіццю маўлення вучняў. Дыдактычным матэрыялам заданняў для перакладу з рускай мовы на беларускую служаць словы або словазлучэнні (*Перакладзіце назвы гандлёвых прадпрыемстваў на беларускую мову*) ці тэксты (*Перакладзіце фрагмент анатацыі на беларускую мову. Назавіце кнігу, пра якую ідзе гаворка, укажыце яе аўтара*).

Адной з навацый, якая істотна паўплывала на распрацоўку алімпіядных заданняў, стала ўкараненне ў адукацыйную практыку кампетэнтнаснага падыходу, які мае на мэце фарміраванне ў вучняў функцыянальнай пісьменнасці, г. зн. здольнасці выкарыстоўваць набытыя веды і навыкі для рашэння жыццёвых задач у розных сферах чалавечай дзейнасці. У комплексных работах апошніх гадоў усё больш значнае месца займаюць кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні – "спецыяльна створаныя дыдактычныя канструкцыі, якія выкарыстоўваюцца для фарміравання і праверкі ўзроўню прадметных, міжпрадметных і ключавых кампетэнцый (кампетэнтнасцей)" [2, с. 7]. Рысамі такіх заданняў з'яўляюцца набліжанасць да рэальнай жыццёвай сітуацыі, міждысцыплінарнасць, ярка выражаны дзейнасны характар. Прыклады такіх заданняў: 1) *У 2016 годзе ў грашовым абарачэнні ў Беларусі пасля доўгага перапынку з'явіліся капейкі. Здагадайцеся, якія фразеалагізмы з гэтым словам у складзе маюць указанае значэнне; 2) Напярэдадні 500-годдзя з дня з'яўлення першай беларускай кнігі Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпусціў серыю манет "Шлях Скарыны", прысвечаных асобным этапам жыцця і творчасці беларускага першадрукара. Устанавіце адпаведнасць паміж рэверсам і аверсам выпушчаных манет; 3) Арганізатары фестывалю беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі AD.NAK! сцвярджаюць, што ўжыванне рэкламы па-беларуску пашырае мэтавую аўдыторыю рэкламадаўцы як мінімум на 25%. Дапамажыце вытворцам перакласці рэкламу тавару і яго назвы на беларускую мову.*

Такім чынам, аналіз комплексных работ, якія выкарыстоўваюцца на раённым этапе рэспубліканскай алімпіяды па мове і літаратуры, засведчыў наяўнасць у заданнях пэўных тыпалагічных асаблівасцей. З пункту гледжання зместу комплексныя работы характарызуюцца значнай колькасцю камбінаваных, у тым ліку інтэграваных, заданняў. Найбольш распаўсюджанымі формамі алімпіядных заданняў з'яўляюцца тэсты рознага тыпу, лінгвістычныя і літаратуразнаўчыя задачы, заданні на пераклад. Адзначана тэндэнцыя павелічэння ў комплекснай рабоце колькасці кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў.

Далейшае даследаванне лінгвістычна-літаратуразнаўчых і метадычных характарыстык алімпіядных заданняў дазволіць зрабіць арганізацыю розных этапаў рэспубліканскай алімпіяды і падрыхтоўку навучэнцаў да іх больш эфектыўнымі.

### Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Доўгаль, Д. А. 100 заданняў для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры : практыкум / Д. А. Доўгаль. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2018. – 80 с.
2. Фасоля, А. Н. Компетентностно-ориентированные задачи. Проблемы терминологии, типологии и создания / А. Н. Фасоля // География. Все для учителя! – 2015. – № 11. – С. 6–9.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова